«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Хойнікі: суд за абразу прэзідэнта зрабілі закрытым

дапоўнена

12.11.2020 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, дыфамацыя



Аляксей Раманаў і Леанід Судаленка

У судзе Хойніцкага раёна 12 лістапада пачаўся разгляд крымінальнай справы гомельскага актывіста **Аляксея Раманава** за абразу прэзідэнта (ч.1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса РБ). Справу ўзбудзіў мясцовы аддзел Следчага камітэта, там прыйшлі да высновы, што ў словах актывіста ёсць склад злачынства.

Справу разглядае раённы суддзя **Андрэй Кардаш.** Інтарэсы Раманава прадстаўляе адвакатка **Рагнэда Тагай.**

Аляксей Раманаў актыўна ўдзельнічаў у перадвыбарнай кампаніі экс-кандыдата ў прэзідэнты Святланы Ціханоўскай, ён таксама з'яўляецца інвалідам другой групы, мае анкалагічнае захворванне, па гэтай прычыне мера стрымання да суда была абраная ў выглядзе падпіскі аб нявыездзе.

28 ліпеня на перадвыбарным пікеце ў Хойніках ён негатыўна выказаўся пра Аляксандра Лукашэнку. У крымінальнай справе пазначана, што Аляксей Раманаў, "маючы намер публічна абразіць прэзідэнта, наўмысна вымавіў словы і фразы ў непрыстойнай форме, якія, згодна з экспертызай, утрымліваюць негатыўную ацэнку прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі". А запіс яго выказванняў на YouTube, маўляў, «была неаднаразова прагледжаны карыстальнікамі інтэрнэту».

На судовым паседжанні 12 лістапада дзяржаўны абвінаваўца пракурор **Андрэй Судом** запрасіў правесці суд у закрытым паседжанні.

Суд пагадзіўся і абвесціў суд закрытым.



Пасля агалошвання матэрыялаў справы пракурор Андрэй Судом запрасіў для абвінавачанага адзін год пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Наступнае судовае паседжанне прызначанае на 18 лістапада.

Артыкул 368 і дыфамацыя

Праваабаронцы нагадваюць, што артыкул 368 Крымінальнага кодэксу, як і некалькі іншых, адносіцца да гэтак званых дыфамацыйных артыкулаў.

Міжнародныя арганізацыі па правах чалавека разглядаюць дыфамацыю ў кантэксце права на выказванне меркавання і права на свабоду слова. Дэкрыміналізацыя дыфамацыйных правапарушэнняў з'яўляецца стандартам, сфармуляваным і абгрунтаваным у рашэннях шэрагу міжнародных арганізацый.

Міжнародная супольнасць пры падтрымцы праваабарончай арганізацыі "Article 19" ў 1995 годзе прыняла Ёханесбургскія прынцыпы. Яны прызначаныя для ўзмацнення артыкула 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, згодна з якім кожны чалавек мае права бесперашкодна прытрымлівацца сваіх меркаванняў.

Згодна з сёмым прынцыпам ніхто не можа быць пакараны за крытыку ці абразу нацыі, дзяржавы або яго сімвалаў, урада, дзяржаўных ведамстваў або дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, калі толькі гэтая крытыка ці абразу не накіраваныя на падбухторванне да гвалтоўных дзеянняў або ж могуць пацягнуць такія дзеянні.

Хто яшчэ на Гомельшчыне абразіў “бацьку”?

Супраць 25-гадовага жыхара Брагіна **Аляксандра Кулага** ўзбуджаная крымінальная справа за абразу Аляксандра Лукашэнкі па ч. 1 артыкула 368 Крымінальнага кодэкса. Пра гэта малады чалавек распавёў на прыёме ў праваабаронцы **Леаніда Судаленкі.**

Інцыдэнт адбыўся яшчэ 16 жніўня. Тады ў бальніцу для медагляду даставілі п'янага мужчыну, у яго было амаль 3 праміле алкаголю.

Знаходзячыся ў прыёмным аддзяленні, малады чалавек паводзіў сябе неадэкватна. Міліцыянты ўціхамірылі дэбашыра. Аднак той не сунімаўся і стаў публічна ў прысутнасці праваахоўнікаў і медыкаў выказваць абразы ў адрас кіраўніка дзяржавы.

З дапамогай службовага відэарэгістратара была зафіксавана і перададзена на экспертызу ягоная гаворка.

Па выніку экспертызы супраць жыхара Брагіна ўзбуджаная крымінальная справа за абразу прэзідэнта.

Хто і калі патрапляў пад дзеянне артыкула 368?

У 2002 годзе, пасля прэзідэнцкіх выбараў, па гэтым артыкуле былі асуджаныя на 2,5 і 2 гады абмежавання волі галоўны рэдактар гарадзенскай газеты «Пагоня» Мікалай Маркевіч і журналіст


газэты Павал Мажэйка. Тады ж за перадрук артыкула з Інтэрнэту і калаж быў асуджаны на 2 гады абмежавання волі галоўны рэдактар газеты "Рабочы" Віктар Івашкевіч.


У 2004 годзе прадпрымальнікам з Гародні Валерыю Леванеўскаму і Аляксандру Васільеву было выстаўленае абвінавачванне паводле арт. 368. Суд прысудзіў абодвух да двух гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму.

У 2016 годзе па гэтым артыкуле абвінавачваўся жыхар Мінска Аляксандр Лапіцкі, супраць якога былі ўжытыя меры бяспекі і лячэння (прымусовае лячэнне ў псіхіятрычнай клініцы).

Опубликовать








пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі

Заява аб прызнанні 13 чалавек палітычнымі зняволенымі

Жанчыну асудзілі па фота з Маршаў, якія захаваліся на воблачным сховішчы яе тэлефона




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 27 сакавіка па 11 красавіка

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 12 па 27 сакавіка

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

"Гэтыя каштоўнасці не прыбраць". Як экс-палітвязні святкавалі Дзень волі ў няволі




ГАЛОЎНАЕ

Праваабаронца Наталля Сацункевіч: "Задача грамадскіх назіральнікаў — прымусіць сістэму выконваць правілы"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

У брэсцкім СІЗА памёр Аляксандр Кулініч, якога абвінавачвалі ў абразе Лукашэнкі

"Следчая адвярнулася да сцяны і заплакала". Гісторыя пенсіянера, якога асудзілі па даносе суседа за ўдзел у пратэстах

Затрыманні журналіста, прадпрымальніка, старшыні АСВОДа: хроніка пераследу 13-15 красавіка (дапоўнена)

Зорку "Што? Дзе? Калі?" Фёдара Шведава ў Гродне судзяць за данаты (дапоўнена)

У Баранавічах за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі

Музыкаў гурта Nizkiz асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі"

Заява аб прызнанні 14 чалавек палітычнымі зняволенымі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2024




ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh



















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

